УДК 7.048(476)
**НОВІК Н.У.**, студэнт
Навуковы кіраўнік **ВАЛЫНЕЦ І.В**., ст. выкладчык
УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»,
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

# КАШТОЎНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ, АДЛЮСТРАВАНЫЯ Ў АРНАМЕНТАХ

**Уводзіны.** Арнамент – гэта адзін з найбольш вядомых відаў мастацкай творчасці нашага народа. Ткацтва і пашыў адзення, ганчарная справа і вышыўка – усё гэта прасякнута выкарыстоўваннем спецыфічнага беларускага арнаменту, ідэнтычнага якому ў свеце няма. Кожны элемент арнаменту – гэта свайго роду тайнапіс, шыфроўка. Беларускі ўзор не проста прыгожыя крыжыкі, квадрацікі і птушкі, а канкрэтнае пасланне, як, напрыклад, еўрапейская геральдыка. Усе ўзоры прызначаны для мноства нагод. Вобразы ўраджаю і ўрадлівасці, маці, роднай зямлі, святаў, песень, язычніцкай міфалогіі, кахання, чалавека, сям'і і дзяржавы, веры і жыцця – беларусы ў сваёй творчасці закранулі амаль усё тое, што атачае чалавека.

**Матэрыялы і метады даследаванняў.** Матэрыялам даследавання паслужылі беларускія арнаменты на ручніках, гліняных вырабах, вышыўках, ткацкіх вырабах [1, 2, 3]. Метад даследавання – апісальны.

**Вынікі даследаванняў.** Са старажытнасці народ жыў з двума асноўнымі заняткамі: земляробствам і жывёлагадоўляй. Адным з самых папулярных узораў на матыў ураджаю была выява бога ўрадлівасці Ярылы. З часу прыняцця хрысціянства Ярыла трансфармаваўся ў Юрыя-Пераможцу, але сутнасць абодвух засталася тоеснай. Вобраз Ярылы-Юр'я на кані шмат дзе сустракаецца, беларускія жанчыны вышывалі яго на ручніках і верылі, што такі арнамент "задобрыць" бога і дапаможа атрымаць добры ўраджай.

Вядома, што яшчэ з першабытных часоў беларусы паважалі і шанавалі жанчыну-маці. Захаваліся шматлікія каменныя і касцяныя жаночыя фігуркі, якія яскрава выказваюць сваю прыналежнасць да мацярынства гіпертрафаванымі формамі. Тагачасныя майстры прысвячалі маці мноства сваіх твораў менавіта таму, што жанчына-маці лічылася абуджальніцай жыцця, нейкім чынам блізкай да багоў.

Сімвал маці ў арнаментыцы – гэта амаль заўжды схематычная выява жанчыны ў сукенцы, у залежнасці ад складанасці ўзору можа вагацца ад нечага накшталт трохвугольніка з галавою да паўнавартаснай жанчыны нават з добра бачнымі рукамі і нагамі. Таксама маці ў беларускім арнаменце мае ўвасабленне ў выглядзе прыадкрытага бутону кветкі.

Яшчэ адным з сімвалаў-асноваў, тых, пра які ніколі не забудзецца ні адзін этнас, з'яўляецца вобраз Радзімы, зямлі-карміцелькі. Туга і боль па Радзіме, любоў да зямлі тых беларусаў, каго лёсам занесла ў іншую краіну, – усё гэта матывавала на стварэнне асаблівага арнаменту. Геаметрычны вобраз роднай зямлі ткачыхамі і вышывальшчыцамі Беларусі рабіўся з самых розных колераў, многія ўвогуле змешвалі некалькі розных адценняў. Так, лічылася, адлюстроўваецца шматграннасць і прыгажосць Беларусі. Зямля-карміцелька ўвасаблялася не толькі ў агульным вобразе, але і ў некаторых "прадстаўніках" гэтай самай зямлі. Часта на посцілках, ручніках, вышыванках беларускіх майстрых сустракаюцца ўзоры, што ўвасабляюць сабой ваду, раку, крыніцы, лес, поле, розных жывёл. І нават такіх істот, як лесавікі і вадзянікі. Узор Лесавіка выглядаў вельмі цікава: галава ў яго як крона дрэва. Адзеты ён у звярыныя шкуры. Рукі і ногі тоўстыя, як ствалы дрэў. Вышываўся ён заўжды на фоне лесу, і беларускі па-майстэрску рабілі нешта накшталт сапраўднай карціны з пярэднім і заднім планамі. Дарэчы, сам Лесавік на ўзоры нагадвае больш за ўсё лася без рагоў – стаіць на чатырох нагах, задраўшы ўгору велічэзную морду з невялічкімі вушамі.

Беларусы, якія добра працавалі, любілі і святкаваць. Свят на беларускай зямлі ў старажытнасці было вельмі шмат. Пачатак новай працы, змена пары года, розныя падзеі ў жыцці кожнага чалавека – усё гэта адзначалі, прычым кожнае свята было са сваім непаўторным каларытам. Вялікдзень, Купалле, Каляды, Масленіца – гэтыя святы былі найбольш яскравымі, асноўнымі ў календары нашых продкаў. Не менш цікавымі і

РЕПОЗИТОРИЙ УО ВГАВМ

каларытнымі былі і сямейныя святы: вяселле, радзіны, хрэсьбіны.

Здаўна склалася так, што музыка мела вялізны ўплыў на людзей. Спявалі заўжды: і падчас працы, і калі адпачывалі. Шырокае распаўсюджанне набыў узор любоўнай песні. Асноўным элементам узору з'яўляецца невялічкі крыжык у цэнтры. Апраўлены ён дзвюма лініямі, якія прыгожа заплятаюцца адна за адну. Такі ўзор вельмі часта сустракаецца на посцілках, ручніках, на тканых вырабах.

Якая б ні была культура, у любой краіне яна так ці іначай прасякнутая некаторымі адгалоскамі язычніцтва. Бог Сонца, Маці-зямля, Месяц, Пярун, Грамавік, Агонь-Жыжаль, Стрыбог-Вецер – усе гэтыя міфалагічныя істоты мелі свае выявы на рэчах, зробленых беларускімі майстрамі. Прычым кожны бог меў адразу некалькі ўзораў, яго можна было выткаць у тым выглядзе, які больш падабаецца беларусцы.

Вобраз кахання ёсць амаль ва ўсіх беларускіх арнаментных спалучэннях. Беларускія жанчыны не спыніліся на адным вобразе кахання. Яны паспрабавалі распісаць у арнаментыцы амаль увесь каларыт пачуццяў чалавека ў рамках любоўных зносін. Каханне і прыгажосць, жаночая доля ў шлюбе, непадзельнае, трагічнае каханне ў вобразе Русалкі, вобраз пачатку новай сям'і, увасоблены ў вянку. Як вядома, у народзе голуб і галубка лічацца сімвалам кахання. Паглядзім, як гэта адлюстроўваецца ў арнаменце ручнікоў, на якіх часта сустракаюцца гэтыя матывы. Голуб ідзе за галубкай – першае знаёмства хлопца з дзяўчынай, каханне толькі пачынаецца. Дзве птушкі павернуты галоўкамі адна да адной, часам букет паміж імі – каханне ў самым росквіце. Калі ж вышываныя ці вытканыя птушкі павернуты ў розныя бакі – каханне скончылася. Гэта паэма пра трагічнае каханне, каханне без узаемнасці.

**Заключэнне.** Кожнае мастацтва адзначана сваім тайнапісам, сімволікай і глыбінным сэнсам. Не выключэнне і беларуская арнаментыка, якая перажыла столькі стагаддзяў і ўсё роўна не страціла асноўных матываў, не спыніла існавання. Нават сёння беларускія майстры і аматары даволі часта вышываюць узоры беларускага арнаменту, узнікла мода на адзенне з арнаментам-вышымайкі, адбыўся парад вышыванак БРСМ у 2017 годзе, нечакана пайшла мода нават на татуіроўкі з цудоўнымі сімваламі. Многія майстры, мастакі і рамеснікі нават робяць нешта накшталт "складанкі" з розных узораў, як рабілі нашы продкі, расказваючы сваю гісторыю праз вышыўку.

Каштоўнасці беларусаў, адлюстраваныя ў арнаменце, атрымліваюць пацяг у сучаснай мастацкай творчасці самых розных накірункаў. І вельмі важна захаваць і перадаць нашчадкам арнамент як крыніцу культурна-гістарычных звестак. Кожны ўзор арнаменту мае сваё прызначэнне і назву. Ён характарызуецца самабытнасцю і вобразнасцю і сімвалізуе дабро, праўду, прыгажосць, любоў, гонар за чалавека і яго працу, любоў і павагу да продкаў, такім чынам сцвярджаючы вечныя каштоўнасці.

***Літаратура.*** *1. Народная культура Беларусі : Энцыклапедычны даведнік / Пад агул. рэд. В. С. Цітова. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с. 2. Кацар, М С. Беларускі арнамент : ткацтва, вышыўка / М. С. Кацар. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 224 с. 3. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / Беларус. савецкая энцыклапедыя ; рэдкал. : І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.*

РЕПОЗИТОРИЙ УО ВГАВМ

УДК 336.22 (476)

**ПОЛИТИДИС Т.В.,** студент
Научный руководитель **ЧЕРНАВИНА Н.А.,** ст. преподаватель
УО «Витебская ордена «Знак Почета» государственная академия ветеринарной медицины», г. Витебск, Республика Беларусь

## ОСОБЕННОСТИ НАЛОГОВОЙ СИСТЕМЫ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

**Введение.** Налоги занимают центральное место среди экономических и правовых ры-